ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДАК "ДЗЕДЗІЧ"

# ДЗЕДЗІЧ

Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.
(Янка КУПАЛА)

№ 3 (11)

ЛІПЕНЬ 2001

3 ДЗЕНЬ СЯМ'І - СЯМЕЙНАЕ СВЯТА

6 ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ ТУРБУЮЦЬ БЕРАСЦЕЙЦАЎ?

4 ДУМКІ АБ РАДЗІМЕ

7 ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ ПРЫ АДМІНІСТРАТЫЎНЫМ ЗАТРЫМАННІ

# ВРЕМЯ НЕПРИМИРИМЫХ БОРЦОВ ЗАКОНЧИЛОСЬ...

МАБЫЦЬ УЖО НЕ ЗАСТАЛОСЯ Ў НАШАЙ КРАІНЕ ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ Б НЕ ВЕДАЛІ, ШТО 9 ВЕРАСНЯ МЫ БУДЗЕМ АБІРАЦЬ НОВАГА ПРЭЗІДЭНТА. ЗАТОЕ АБ ТЫМ, ХТО Ж БУДЗЕ ЗМАГАЦЦА ЗА ГАЛОЎНУЮ ПАСАДУ КРАІНЫ, ВЕДАЮЦЬ ДАЛЁКА НЕ УСЕ І НЕ ЎСЁ. УЛІЧВАЮЧЫ АМАЛЬ ПОЎНЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ВАКУУМ У КРАІНЕ, МЫ ВЫРАШЫЛІ ПАЗНАЁМІЦЬ СВАІХ ЧЫТАЧОЎ З НАЙБОЛЬШ ПЕРСПЕКТЫЎНЫМ НА НАШУ ДУМКУ КАНДЫДАТАМ, АЛЬТЭРНАТЫЎНЫМ СЁННЯШНЯЙ УЛАДЗЕ. ЗНАЁМЦЕСЯ: СЯМЁН МІКАЛАЕВІЧ ДОМАШ.

**- Семен Николаевич, сегодня наша страна находится накануне выборов нового президента Республики Беларусь. Более двадцати кандидатов претендуют на этот пост. Какие качества, на Ваш взгляд, обязательно должен иметь новый глава государства?**

- Во-первых, он должен быть уравновешенным, серьезным, ответственным человеком. Во-вторых, новый глава государства обязан пройти основные ступени управленческой лестницы. Только тогда человек приобретает необходимый опыт и появляются какие-то гарантии от непоправимых ошибок. Последние семь лет всем нам прекрасно показали что бывает, когда человек перепрыгивает через множество ступенек, и из директора совхоза внезапно превращается в президента. Все говорят, что Лукашенко очень старается, но у него не получается или ему мешают. У него и не может получиться, потому что сел не в свои сани.

**- А есть ли опыт государственного управления у Вас?**

- Вполне достаточный. В 24 года уже был директором автобазы, а в 27 лет возглавил Гродненский автокомбинат. Был председателем исполкомов Лиды и Гродно. Колоссальный опыт государственной деятельности дало руководство Гродненской областью в качестве председателя облисполкома (1993-1994 гг.) и председателя областного Совета народных депутатов (1993-1996 гг.). Был депутатом Верховного Совета 12-го и 13-го созывов, членом Президиума Верховного Совета Республики Беларусь.

Имею два диплома: экономиста и механика по ремонту автомобилей. К тому же 51 год - оптимальный возраст для политика, когда он находится на подходе к пику своих возможностей, интеллектуальных и физических.

**- А что является сегодня самым характерным для белорусской политики?**

- Пришло время новой политики, новых подходов и новых лидеров. В 90-е годы в общественной жизни Беларуси доминировали крайний радикализм и политическая неустойчивость. Лукашенко и Позняк - на первый взгляд - два политических антипода. Но на самом деле они близнецы-братья. Суть их политической философии – постоянная и беспощадная борьба с мнимыми врагами, внутренними и внешними. Только Позняк считает врагом Восток, а Лукашенко - Запад. По своей природе это разрушители, революционеры и ниспровергатели. Однако время пламенных революционеров и непримиримых борцов безвозвратно закончилось. Сегодня требуются усилия профессиональных хозяйственников и управленцев.



Пора налаживать полноценную жизнь. Пришло время созидать. Для этого, прежде всего, необходимо преодолеть раскол нашего общества. Хватит уже делить народ на друзей и врагов, своих и чужих. Мы все, независимо от политических убеждений, возраста, пола, национальности, религиозной принадлежности, языковых предпочтений, дети этой земли, граждане этой прекрасной страны. Ее хватит на всех. Давайте построим вместе Дом Наш – Беларусь, в котором всем его жителям найдется достойное место.

**- Иногда кажется, что страна зашла в глухой тупик. Видите ли Вы пути выхода к свету?**

-У меня есть абсолютно надежная программа вывода Беларуси из кризиса, подготовленная лучшими специалистами в области экономики. В ней подробно, по месяцам расписано, что нужно делать. За основу взят опыт Польши и других соседних стран, которые начинали с одинакового с нами уровня жизни, но за последние годы успешно осуществили реформы и достигли уровня средней зарплаты в 500 долларов.

Я не собираюсь вступать в заочное соревнование по поводу обещаний о размерах средней зарплаты. Хочу лишь заметить, что поставленная нынешними властями планка, обещающая 250 долларов через пять лет, при грамотной экономической политике может быть достигнута уже в следующем году.

Нужно ликвидировать все препятствия, мешающие нормальному развитию предпринимательства. В первую очередь - ввести заявительный принцип для открытия собственного дела, создания юридической базы. Если, например, человек хочет на дому ремонтировать обувь, то он не должен обивать пороги чиновничьих кабинетов и просить разрешения.

Нужно сократить количество налогов примерно в три раза, а размер налогов - в два раза. Опыт России хорошо показал, что резкое сокращение размера налогов ведет к существенному росту налоговых поступлений.

Нужно создать условия, когда белорусские предприятия и предприниматели не будут вывозить деньги за рубеж, а станут вкладывать их в нашу экономику. Тогда придут и иностранные инвестиции.

Нужно снять запреты на вывоз товаров за пределы Беларуси.

Нужно сократить государственные расходы за счет сокращения управленческого аппарата (в первую очередь, ликвидировать идеологическую вертикаль), многочисленной президентской охраны, отказа от ненужных и колоссальных расходов на проведение парадов, «дожинок» и др.

И прежде всего необходимо предпринять самые простые меры, не требующие никаких денежных затрат или времени на подготовку законов. Нужно упразднить все запреты, мешающие людям самим зарабатывать деньги для себя и для своих родных.

## ТЫ ВЫРАШАЕШ!

**Як вядома**, 17 сакавіка 2001г. шэраг буйных незалежных моладзевых арганізацый Берасця ўтварыў кааліцыю, асноўнай мэтай якой стала мабілізацыя моладзі да ўдзелу ў выбарах, стварэнне ў моладзевым асяродку ОК-настрою і ўпэўненасці ў переменах. Арганізатары кааліцыі запланавалі шэраг акцый і мерапрыемстваў, з дапамогай якіх плануецца прыцягнуць моладзь Берасця да ўдзелу ў выбарах. Так, 28 ліпеня, на Дзень горада, будзе арганізаваны валейбольны турнір, 5 жніўня – тэнісны, а 18 жніўня і 6 верасня – футбольныя гарадскія турніры. Конкурс графіці запланавана правесці 25 жніўня. Адна з галоўных падзей мабілізацыйнай кампаніі ў Берасці – рок-канцэрт беларускай музыкі – пройдзе 23 жніўня. Зусім хутка (21-23 ліпеня) пройдзе веларабег "Мост у будучыню". Удзельнікі прабегу праедуць па маршруту Камянюкі-Камянец-Волчын-Берасце-воз. Белае-Люблін. Напярэдадні выбараў валанцёры моладзевых арганізацый будуць праводзіць кампанію "Ад дзвярэй да дзвярэй". Яны будуць абыходзіць кватэры і запрашаць берасцейцаў прыйсці на выбары. Усяго плануецца абыйсці 4000 кватэр у розных раёнах горада.

***

Яшчэ раней за Берасцейскую гарадскую кааліцыю моладзевых арганізацый паўстала Берасцейская абласная кааліцыя (15 студзеня 2001 г.). Яна аб'ядноўвае моладзевыя арганізацыі усіх буйных гарадоў Берасцейшчыны, якія плануюць як свае мясцовыя мабілізацыйныя акцыі (канцэрты, конкурсы, раздача мабілізацыйных матэрыялаў), так і агульнаабласныя акцыі, сярод якіх адна з найбуйнейшых – вандроўка "Рух Добрай Волі". Яе ўдзельнікі за 15 дзён плануюць пешшу прайсці па маршруту Столін-Берасце, заходзячы ў падарожныя населеныя пункты, каб заклікаць мясцовых жыхароў прыняць удзел у выбарах. Вандроўка пройдзе праз 58 вёсак і 7 гарадоў Берасцейскага Палесся.

**Ул. інфармацыя**

**Пятніца, 13...** Менавіта ў гэты «чорны» дзень ліпеня берасцейскія «зубры» адлюстравалі ў сваёй акцыі адзін з чорных бакоў беларускай рэчаіснасці. Гэта так званая «сенная ліхаманка», эпідэмія якой не першы год гуляе па гарадзкіх школах, шпіталях, ды інш. установах. Інфэкцыя працякае ў наступным выглядзе: працоўныя калектывы раптам перастаюць займацца сваёй звычайнай працай і масава цягнуцца ў калгасы нарыхтоўваць сена. Хвораму няма паратунку, пакуль ён не накосіць 400 кг сена. Адзіным прафіляктычным сродкам ад немачы на сёння з"яўляецца грашовы водкуп. Але ж тых грошаў меншае і меншае. Вось чаму «зубры» прапанавалі новы мэтад лячэння. На пр. Машэрава ў цэнтры Берасця яны пачалі касіць імправізаваную траву. Косамі ды сярпамі яны не здолелі даць рады сену, і тады схапіліся за нажніцы. Тут з натоўпу выскачыў галоўны разносчык інфэкцыі, апрануты ў хакейны шлем, з клюшкаю ў руках, з характэрнымі вусамі і зачосам. Бачачы небаяздольнасць інтэлігенцыі, «Самы» пачаў вучыць касіць сена клюшкай, прыгаворваючы: «Пацяраем учыцеля — капец, будзем хадзіць п'яные і дурные!». Растлумачыўшы сваю дасведчанасць тым, што ў дзяцінстве ён «рос сряді расценій і жавотных», «работал на сяле і жыл з мужыкамі», «Галоўны» стаў заклікаць усіх запар нарыхтаваць тону сена. За гэта ўжо заўтра паабяцаў выплаціць па 200 даляраў. Многія пачалі паддавацца каварнай хваробе. Але ў гэты час на дапамогу пацярпеўшым з"явіліся санітары і папярэдзілі ўсіх, што вусаты з"яўляецца разносчыкам сеннай ліхаманкі. Вусатага вылавілі, загрузілі ў машыну хуткай дапамогі і адвезлі, куды трэба. Доктар-псіхатэрапэўт Зубр на развітанне сказаў, што такім чынам ліхаманку належыць лякалізаваць не толькі ў нашым горадзе, але і па ўсёй краіне. Нам трэба зрабіць выбар на карысць уласнага здароўя.

**«Зубр», Берасце**

# ВРЕМЯ НЕПРИМИРИМЫХ БОРЦОВ ЗАКОНЧИЛОСЬ...

Короче говоря, доходы будут увеличены за счет стимулирования экономической деятельности, увеличения количества хозяйственных субъектов, платящих налоги.

**- Широко бытует мнение, что перед выборами политики много обещают, расхваливают свои достоинства, но когда приходят к власти, то начинают воровать и злоупотреблять своим положением. Что Вы можете сказать на этот счет?**

- К сожалению, это правда. Такие политики есть и за примерами ходить далеко не надо. Кто-то может поклясться, что он не такой и при этом положить руку на сердце, как это делает известный нам «товарищ». Одни им поверят, другие – нет.

Воровство и безнаказанность чиновников прекрасно существуют лишь в системе государственного беззакония. Если властитель сам себе законодатель, исполнитель и судья, то кто его может поставить на место? Поэтому я предлагаю принципиально иной подход к решению этой проблемы. Нужно создавать такую систему государственного управления, при которой воровать стало бы весьма и весьма проблематично. Это разделение законодательной, исполнительной и судебной властей. Это свобода слова в соответствии с конституционными принципами и независимость средств массовой информации от государственных чиновников. Это сокращение количества запретов в экономической сфере, которые провоцируют взяточничество. Это неуклонное соблюдение всех гражданских прав и свобод. Жесткие моральные требования к власть имущим, должны быть закреплены в профессиональных кодексах.

Нужно реформировать саму систему власти. Сделать прозрачными и демократичными выборы. Словом, это новый для нашей страны подход к решению старых проблем, который, тем не менее, уже показал свою эффективность в других странах. Не нужно изобретать велосипед. Все, что нам нужно для решения этой проблемы, уже есть в мировом опыте.



**Сямён Домаш з унукам Арцёмам**



**Сямён Домаш побач са сваім домам на вул. Лермантава ў Гародні. Фота: IREX/ProMedia**

**- Семен Николаевич, есть еще одно проклятие нашего общества – массовое пьянство. Народ просто спивается. Как решить эту проблему?**

- Мне недавно рассказали об одном очень талантливом человеке, который часто и регулярно напивался до безобразия. Его теща – мудрая женщина – подарила ему «Запорожец». А человек мечтал об автомобиле. И когда мечта сбылась – он перестал пить.

Пьянство, как явление, имеет много составляющих. Но само по себе оно сигнализирует о неблагополучии общества. И прежде всего – об экономическом неблагополучии. Если человек не имеет возможности развить свои таланты и способности, если у него нет никакой светлой жизненной перспективы, если он унижен безработицей или подачками, называемыми зарплатой, если он оказался в кругу безысходности, страха или разочарования, тогда он заглушает свои проблемы спиртным. И совершенно естественно, что в Беларуси алкоголизм стал особенно энергично расцветать в последние годы, характерные некомпетентным и авторитарным руководством экономикой, предельно сузившей возможности людей во всех сферах, кроме полицейской.

Хороший хозяин, заботливый семьянин, обеспеченный человек никогда не станет алкоголиком. Алкоголиками, преимущественно, становятся безработные, бедные, бездомные, бессемейные люди. А таких сейчас очень и очень много.

**- Занятия спортом с недавнего времени стали модными у политиков. Вы какой вид спорта предпочитаете?**

- Заниматься спортом надо не для моды и не для показухи, а для собственного здоровья. Нелепо бегать на лыжах по асфальту только потому, что ты считаешь себя хорошим лыжником. Я занимался многими видами спорта. Бегом, карате, игровыми видами. Сейчас занимаюсь атлетической гимнастикой. Но наибольшие успехи были у меня в боксе, где добился уровня кандидата в мастера спорта. Навыки не растерял, всегда готов постоять за себя и своих близких в любой ситуации.

## ДАРЭЧЫ

А. Лукашенко подписал Декрет, согласно которому кандидат в президенты должен иметь стаж работы президентом не менее 5 лет.

**15 ТРАЎНЯ - МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ СЯМ'І**

# СЯМЕЙНАЕ СВЯТА «Дзедзіча»

ВОСЕМ ГАДОЎ ТАМУ, 15 ТРАЎНЯ 1993 ГОДА, ГЕНЕРАЛЬНАЯ АСАМБЛЕЯ ААН АБ'ЯВІЛА МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ СЯМ'І, ЯКІ АДЗНАЧАЕЦЦА З 1994 ГОДА. ВА ЎСІ ЧАСЫ ЛЮДЗІ ЎСЕ САМАЕ СВЕТЛАЕ, ДОБРАЕ ЗВЯЗВАЛІ СА СВАІМІ СЕМ'ЯМІ. БАЦЬКОЎСКАЕ ВЫХАВАННЕ, ЗАКЛАДЗЕННАЕ Ў ДЗЯЦІНСТВЕ СКАЗВАЕЦЦА НА ДАЛЕЙШЫМ ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА, НА РАЗВІЦЦІ ГРАМАДСТВА.



**Беларускія Ева і Адам знайшлі свой яблык**

У аўторак 15 траўня каля 19 гадзін і ў нас, у «Дзедзічы», пачаўся невялікі вечар прысвечаны гэтаму дню. Асноўным каардынатарам быў Шастак Дзмітрый, а тэарэтычную частку падрыхтавала і вяла Алена Брэль.

Тых, хто прыйшоў "без пары", разгрупавалі на "хлопчык – дзяўчынка". Так пачалася першая частка: тэорыя сямейных адносін. Высветлілася, што сучасная моладзь вельмі добра падрыхтавана ў тэарэтычным плане. Не цяжка было пералічыць важныя элементы сямейных адносін (давер, павага, жаданне выслухаць і дапамагчы, увага да праблем партнера і г.д.), а вось фармулёўку паняцця сям'і амаль кожная пара прапанавала сваю. Да нашых разваг Алена дадавала цікавую інфармацыю (напрыклад, пра розніцу псіхалогіі мужчын і жанчын), чым падштурхоўвала і накіроўвала філасофскія думкі і аналіз практычных назіранняў у адзінае рэчышча. Дзяліліся таксама і рэцэптамі вырашэння канфліктаў: ад "не хапайся за гарачае" да "у нас усё вырашае сэкс". Па рознаму мы ўяўлялі і мадэлі "нашай" і "заходняй" сям'і, пры чым большыя разыходжанні былі ў асэнсаванні "нашых".

"Практычная" частка была накіравана на выяўленне "самай – самай" пары (дарэчы, у конкурсах удзельнічала і сапраўдная сям'я). Самая галодная пара павінна была хутчэй за іншых з'есці прапанаваныя яблыкі і сасіскі, але пры гэтым трымаць рукі далей і ад ежы, і ад талеркі. Самая беларуская пара дэманстравала сваю знаходлівасць: складала з прапанаваных слоў прызнанне ў каханні (словы былі зусім не па тэме). Самая сагласаваная пара высветлілася ў конкурсе, калі трэба было з'есці яблык, не датыкаючыся да яго рукамі. Гэта быў, мабыць, самы эратычны конкурс, бо яблыкі закатваліся за вопратку, і іх даводзілася "выгрызаць" адтуль. Самая неакуратная пара здолела за 15 секунд разрэзаць прэзерватыў на 14 кружкоў. А самая моцная пара танчыла вальс, абмотаная цэлым рулонам туалетнай паперы. І, нарэшце, "самая – самая" пара была вызначана тайным галасаваннем. Гэта Уладзімір і Алена. Спадзяюся, што супер-прыз, які яны атрымалі, адлюстраваў у сабе ўсе бакі сямейнага жыцця і яшчэ не адной-чы спатрэбіцца ім.

У межах вечарыны таксама было праведзена анкетаванне.

Жадаем усім сем'ям шчасця, добрага здароўя, узаемапаразумення. Няхай мір не пакідае вашыя дамы!

**Валодзька Вольга**



**Узнагароджванне ідэальнай пары вечара**

# ДУМКІ АБ СЯМ'І

## УСУР'ЁЗ І ЖАРТАМ

У Дзень сям'і сярод дзедзічаў праводзілася анкетаванне аб іх думках наконт ідеальных сем'яў, мужчын і жанчын, колькасці будучых дзяцей, адносін да сэксу.

Удзельнічала 15 асоб мужчынскага роду ва ўзросце ад 18 да 25 год, 15 жаночага ад 17 да 28 год і адна асоба – ніякага, але ж аб ім потым.

Цікавыя вынікі атрымаліся пры адказе на пытанне наконт стаўлення да палавых зносін перад шлюбам. З ніжэй прыведзенай табліцы бачна што большасць апытаных (80% хлопцаў і 60% дзяўчат) выказаліся за сэкс перад шлюбам. Вынікі асабліва не ўражваюць: такая тэндэнцыя назіраецца ўжо прыкладна апошнія 15 гадоў.

| | За | Супраць | Цяжка адказаць |
|---|---|---|---|
| Муж | 80% | 0% | 20% |
| Жан | 60% | 7% | 33% |

Вынікам стварэння сям'і часцей за ўсё з'яўляюцца дзеці. Колькі іх павінна быць – кожны вырашае сам. Нашае анкетаванне падцвердзіла, што большасць апытаных хацела б выхоўваць дваіх дзяцей (гл. таб.1).

А цяпер пераходзім да галоўных пытанняў нашага анкетавання. Гэта ўяўленні дзедзічаў аб ідэальнай сям'і. Вось якія вынікі атрымаліся, калі яны адказвалі на пытанне: "Што для Вас галоўнае ў сям'і?":

| № | жан | муж |
|---|---|---|
| 1 | **давер** | **каханне** |
| 2 | **каханне** | **давер** |
| 3 | **вернасць** | **сэкс** |
| 4 | **згода** | **вернасць** |
| 5 | **сэкс** | **дзеці** |
| 6 | **багацце** | **згода** |
| 7 | **дзеці** | **спакой** |
| 8 | **спакой** | **багацце** |

Актуальнымі былі пытанні аб тым, якімі павінны быць ідэальная жанчына і ідэальны мужчына. Прапануем іх вынікі ў таб. 2.

А цяпер пяройдзем да жартаў нашага анкетавання. На самым пачатку мы заінтрыгавалі Вас асобай ніякага полу. Як ён сам прызнаўся, яго пол – дзіцячы (узрост на момант адказу – 18 гадоў 22 дня 18 гадзін 54 хвіліны 41 секунда. Без каментараў прыводзім яго адказы: Колькі дзяцей, на Вашу думку, павінна быць у ідэальнай сям'і? – *Паболей.*

Колькі дзяцей Вы хацелі б мець? – *Кожны дзень па два-тры.*

Ваша стаўленне да палавых зносін перад шлюбам (за, супраць, цяжка адказаць)? – *Гледзячы з кім.*

**таб. 1**

| Колькасць дзяцей: | | 0 | 2 | 3 | 4 | 5 | болей | Не ведаю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| адказваюць: | муж. | 7% | 46% | 27% | 0% | 0% | 13% | 7% |
| | жан. | 0% | 72% | 7% | 7% | 7% | 0% | 7% |

Ён меў рацыю пры размяшчэнні рыс, уласцівых ідэальнай сям'і,

| Ідэальная жанчына | |
|---|---|
| Адказваюць жанчыны | Адказваюць мужчыны |
| **1 разумная** | **1 верная** |
| **2 добрая, пяшчотная** | **2 прыгожая** |
| **3 сэксоўная** | **3 добрая, пяшчотная** |
| **4 гаспадарлівая** | **4 сэксоўная** |
| **5 прыгожая** | **5 гаспадарлівая** |
| **6 верная** | **6 разумная** |
| **7 сціплая** | **7 сэксапільная** |
| **8 сэксапільная** | **8 сціплая** |
| Ідэальны мужчына | |
| Адказваюць жанчыны | Адказваюць мужчыны |
| **1 разумны** | **1 разумны** |
| **2 здаровы** | **2 гаспадарлівы** |
| **3 шчыры** | **3 здаровы** |
| **4 гаспадарлівы** | **4 шчыры** |
| **5 багаты** | **5 моцны** |
| **6 пяшчотны** | **6 багаты** |
| **7 смелы** | **7 галантны** |
| **8 моцны** | **8 смелы** |
| **9 галантны** | **9 пяшчотны** |

**таб. 2.**

паставіўшы ўсё на першае месца. Паняцця аб ідэальнай жонцы ў яго няма, побач з прапанаванымі рысамі ідэальнай жанчыны было знойдзена наступнае: "*А тут я не ведаю. Я малы, мне нельга, мама не дазваляе*".

Вось такая цікавая асоба жыве сярод нас. Мы здагадваліся, але толькі анкетаванне яе выявіла.

Спадзяемся, што Вам было цікава даведацца аб меркаваннях нашых дзедзічаў.

**Двулікі Дзікі**

# АБ’ЯДНАНЫМІ НАМАГАННЯМІ

ТВАЕ ПРАБЛЕМЫ ВЫРАШАЦЦА ТОЛЬКІ ТАДЫ, КАЛІ ТЫ САМ ПАЧНЕШ ІХ ВЫРАШАЦЬ! ГЭТЫЯ СЛОВЫ СТАЛІ ДЭВІЗАМ ДЛЯ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПРАЕКТА “VIRIBUS UNITIS” (“АБ’ЯДНАНЫЯ НАМАГАННІ”), ПЕРШЫ БЕРАСЦЕЙСКІ ЭТАП ЯКОГА ПРАХОДЗІЎ 2-3 ЧЭРВЕНЯ Ў ЦЭНТРЫ “ВЕЖА”.

Мэтай праекта, як сцвярджаюць арганізатары, моладзевае грамадскае аб’яднанне “Новая група” і ГА “Маладзёвы адукацыйны цэнтр “Фіальта”, з’яўляецца «павышэнне ўзроўня грамадзянскага ўдзелу маладых людзей РБ у вырашэнні сацыяльна-значных праблем мясцовага, рэгіянальнага, нацыянальнага маштабаў, шляхам правядзення адукацыйных і інфармацыйных праграм». “У Беларусі,— сцвярджаюць арганізатары праекта, — першыя выбары, пры правядзенні якіх выбаршчыкі мелі магчымасць прадэманстраваць свядомае прыняцце рашэння, адбыліся ў 1990 г. Моладзь, якая з’яўляецца мэтавай групай праекта, у тых выбарах не удзельнічала, абставіны складаліся так, што і ў далейшым набыццё грамадзянскай і прававой культуры было немагчыма. Правядзенне рэферэндума ў 1996 г. дало негатыўны прыклад працэдуры дэмакратычнага прыняцця рашэнняў. Парушэнне законаў і фальсіфікацыя вынікаў сфарміравалі ў свядомасці маладых выбаршчыкаў устойлівы стэрэатып аб бессэнсоўнасці іх удзелу ў грамадскіх працэсах”.

Праграма рэалізуецца ва ўсіх рэгіёнах краіны і складаецца з некалькіх этапаў. На першым, гаворкай аб якім распачаўся наш артыкул, праводзіўся трэнінг для мультыплікатараў па тэме “Грамадзянская адказнасць моладзі”. Другія этапы падрыхтаваным мультыплікатарам даюць рэальную магчымасць замацаваць атрыманыя веды на практыцы шляхам правядзення асабістых інфармацыйна-асветніцкіх сустрэч, кампаній па адстойванню інтарэсаў маладых людзей.

У сувязі з гэтым, на семінары разглядаліся самыя разнастайныя тэмы: «Хто з’яўляецца грамадзянінам РБ?», «Актыўны грамадзянін. Хто ён?», «Што такое грамадзянскі ўдзел?». Акрамя таго, закраналіся такія моманты, як складанне ўлётак, напісанне прэс-рэлізаў, петыцый, лістоў афіцыйным асобам і іншае.

Удзельнікі, як прадстаўнікі недзяржаўных арганізацый Берасця і вобласці (“Расток”, “Форум”, ЗБС, “Паветра”, “Абракадабра”, “Новая Эра”, “Гном”, “Неруш”, “Дзедзіч” і іншыя), так і проста актыўная студэнцкая і вучнёўская моладзь, уздымалі найбольш актуальныя для сябе праблемы, над якімі яны ў далейшым будуць працаваць: разбітыя дарогі ў горадзе, забруджанасць р. Мухавец, недастатковая інфармацыйная насычанасць малых гарадоў, адсутнасць літаратурна-творчага Internet-часопіса для моладзі, наяўнасць неўрозаў у сучасных мужчын, спосабы барацьбы з імі і шмат-шмат іншых. Як бачыце, праблемаў, якія хвалююць нашую моладзь, даволі шмат. Напрыканцы сустрэчы кожны з падрыхтаваных мультыплікатараў атрымаў навучальны дапаможнік “Другі крок”, распрацаваны ў рамках праекта для далейшай працы.

Зацікавіўшыся праектам, сустрэчу наведалі прадстаўнікі Берасцейскага тэлебачання і радыё, паабяцаўшы інфармацыйную падтрымку праекту.

Ужо на сённяшні дзень распачата дзейнасць па яго рэалізацыі (Акцыі “Моладзь—рухавік часу”, “Сделаем мир чище”, “Лето—будет”, “Internet-часопіс” і іншыя), мультыплікатарамі распрацавана “мясцовая” улётка.

Трэба адзначыць, што не апошняя роля ў дапамозе рэалізацыі праекта па Берасцю і вобласці належыць і ДАК “Дзедзіч”, які каардынуе яго на месцы і куды можна звярнуцца па ўсіх пытаннях, звязаных з праектам.

Плануецца, што на заключным этапе (13-19 жніўня), у Менску адбудзецца выніковая Канферэнцыя, на якую будуць запрошаны найбольш актыўныя ўдзельнікі з розных рэгіёнаў, а ўсяго ў праект будзе уцягнена каля 22350 маладых людзей. Такім чынам, хочацца пажадаць поспехаў і веры ў тое, што аб’яднанымі намаганнямі мы зробім сабе БУДУЧЫНЮ.

**Адэлька Лапаць**

## МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ

ЁСЦЬ У НАШАЙ ГАЗЕЦЕ РУБРЫКА “МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ”, ДЗЕ МЫ ДАЕМ СЛОВА ПАЧЫНАЮЧЫМ ТВОРЦАМ. ДЛЯ НЕКАТОРЫХ З ІХ ГЭТА АМАЛЬ НЕ АДЗІНАЯ МАГЧЫМАСЦЬ ЗНАЙСЦІ ДАРОГУ ДА ЧЫТАЧА. УЯВІЦЕ САБЕ НАША ПРЫЕМНАЕ ЗДЗІЎЛЕННЕ, КАЛІ НАШЫМ ВЫДАННЕМ ЗАЦІКАВІЎСЯ І НАВАТ ПРАПАНАВАЎ СВАЕ, РАНЕЙ НІДЗЕ НЕ НАДРУКАВАНЫЯ ВЕРШЫ ВЯДОМЫ НАВУКОВЕЦ І ПАЭТ, ДОКТАР ФІЛАЛАГІЧНЫХ НАВУК М. І. МІШЧАНЧУК.

ГЭТА ІМЯ ДОБРА ВЯДОМА НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ БРДУ, ДЗЕ МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ ВОСЬ УЖО НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ УЗНАЧАЛЬВАЕ КАФЕДРУ ГІСТОРЫІ І ТЭОРЫІ РУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ. АЛЕ ГАЛОЎНАЙ ТРЫВОГАЙ М. І. МІШЧАНЧУКА ЗАСТАЕЦЦА ЛЁС БАЦЬКАЎШЧЫНЫ, АБ ЧЫМ СВЕДЧАЦЬ ВЫДАДЗЕНЫЯ ІМ ЗБОРНІКІ ВЕРШАЎ “ВЕРНАСЦЬ” І “ТРЫВОЖУСЯ ЗА БЕЛЫ СВЕТ” І НІЗКА НОВЫХ ВЕРШАЎ ПАЭТА.

# РАДЗІМА НА УСІХ АДНА

М. І. МІШЧАНЧУК

## Трыялеты

***

Радзіма на ўсіх нас адна –
Вясновай кветкай расцвітае,
Усмешкай цеплай спавівае...
Радзіма на ўсіх нас адна.

Яна па свеце ўсіх збірае,
Хто выпіў чашу слез да дна...
Радзіма на ўсіх нас адна –
Вясновай кветкай расцвітае.

***

Радзіма на ўсіх нас адна,
Бы промень, сон наш разганяе
І жыць надзеяй заклікае.
Радзіма на ўсіх нас адна.

Пакрыху боль душы сціхае,
І ў сэрцы гнездзіцца вясна ...
Радзіма на ўсіх нас адна,
Бы промень, сон наш разганяе.

***

“Радзіма на ўсіх нас адна!” –
Званы на вежы прамаўляюць.
Маланкі золата страсаюць...
Радзіма на ўсіх нас адна.

А у небе ластаўкі крыляюць,
Б’юць промні ў шыбіны акна ...
“Радзіма на ўсіх нас адна!” –
Званы на вежы прамаўляюць.

***

Радзіма на ўсіх нас адна,
Збавення ад бяды чакае,
Сыноў з усіх дарог збірае...
Радзіма на ўсіх нас адна.

А хвалі бераг разрываюць –
Ніяк іх сілай не суняць.
Радзіма на ўсіх нас адна,
Збавення ад бяды чакае.

***

Радзіма на ўсіх нас адна...
Скідайма зла сівыя хмары,
Гадуйма зерні светлыхмараў.
Радзіма на ўсіх нас адна.

Не дазваляйма ў сэрца ўдарыць,
Той, што грудзьмі ўскарміла нас...
Радзіма на ўсіх нас адна...
Скідайма зла сівыя хмары.

***

Радзіма на ўсіх нас адна –
Наперад з ей удалеч крочым.
А з неба Бог за намі сочыць
Радзіма на ўсіх нас адна.

На змену дню прыходзяць ночы,
Трымціць ад радасці сасна...
Радзіма на ўсіх нас адна.
Наперад з ей ўдалеч крочым.

***

Радзіма на ўсіх нас адна,
У легкай вопратцы дзявочай...
Няхай ей шчасця лес надточыць –
Радзіма на ўсіх нас адна.

Няхай ей смерць даўно прарочыць –
Звініць жыцця яе струна.
Радзіма на ўсіх нас адна,
У легкай вопратцы дзявочай.

***

Радзіма на ўсіх нас адна
Зіяе зоркай ў цемнай ночы
І шчасцем росіць нашы вочы...
Радзіма на ўсіх нас адна.

Глядзіць на зоры светлы хлопчык...
Празрыста ззяе цішыня...
Радзіма на ўсіх нас адна
Зіяе зоркай ў цемнай ночы.

***

Радзіма на ўсіх нас адна,
Патрэбная зямлі і небу –
Глыток вады, скарынка хлеба...
Радзіма на ўсіх нас адна.

Сягоння нам усім патрэбна
Яе нясціхны боль суняць...
Радзіма на ўсіх нас адна,
Патрэбная зямлі і небу.

***

Радзіма на ўсіх нас адна.
Атулім ласкай яе плечы,
Лагодна скажам: “Шчэ ня вечар!”
Радзіма на ўсіх нас адна.

Хоць шмат бяды, палаюць свечы
І ззяе вогнікам яна –
Радзіма на ўсіх нас адна...
Атулім ласкай яе плечы.



Фота: IREX/ProMedia

## ЗАСПЯВАЕМ?

ІМКНУЧЫСЯ ЗРАБІЦЬ НАША ВЫДАННЕ БОЛЬШ ПРЫВАБЛІВЫМ ДА ЧЫТАЧА, МЫ АДКРЫВАЕМ РУБРЫКУ, ЯКАЯ, СПАДЗЯЕМСЯ БУДЗЕ ЦІКАВАЙ ДЛЯ ЎСІХ, ХТО ЛЮБІЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ З ПЕСНЯМІ ПАД ГІТАРУ І ХАЦЕЎ БЫ СПЯВАЦЬ БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ. А КАЛІ Ў ВАС ЁСЦЬ ТЭКСТЫ БЕЛАРУСКІХ ПЕСЕНЬ З АКОРДАМІ, ПРЫНОСЬЦЕ ІХ НАМ - МЫ З ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ ІХ НАДРУКУЕМ.

# БЕЛАРУСЬ МАЯ

```
Am          Dm          E          Am
Аксамітны летні вечар ахінуў зямлю,
        Dm          G          C
Я азёрную сінечу вуснамі лаўлю,
A             Dm          G          C/E
Моўчкі слухаю ў росах песню салаўя,
Am          Dm          E          Am
Над маім лунае лёсам, Беларусь мая!
```

А над лесам над сусветам выпрастаў крыло
Залацісты човен-ветраз, зорнае вясло.
Стан дзявочы Белай Вежы, подых ручая.
Я адной табе належу, Беларусь мая!

Там, дзе гойдае вятрыска залаты мурог,
Паўставалі камяніскі ля тваіх дарог,
Чырванее ранні золак, рэха ў гаях,
А ў грудзях тваіх асколак, Беларусь мая!

Мне краёў чужы не трэба, як не варажы,
Не хачу чужога хлеба, радасцяў чужых.
Бо чужына сэрца жаліць, цісне як змяя,
Бо гукае з дальніх даляў, Беларусь мая!

*Ад прадзедаў, спакон вякоў... (Я. Купала)*

# TERRA INCOGNITA БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ

ЗІНАІДА ГІПІУС У СВАІМ ДЗЁННІКУ ПІСАЛА: «БАЛАХОВІЧ – ІНТУІТ, ДЗІКУН І СВАВОЛЬНІК. НЯНАВІСЬЦЬ ДА БАЛЬШАВІКОЎ - ГЭТА ЯГО ЎСЕАХОПНАЕ ПАЧУЦЬЦЁ. АДНАК ПРЫ ТЫМ ЁН ЯШЧЭ І ХІТРЫ, САМАЎПЭЎНЕНЫ І СЕБЯЛЮБНЫ. ЗУСІМ НЕ «РАЗУМНЫ», АДНАК У ІМ ЁСЬЦЬ ІСКРЫНКІ НЕЙКАЕ ІНТУІЦЫІ... БАЛАХОВІЧ - ГЕНЭРАЛ З «САКРЭТАМ»».



Ген. Станіслаў Булак-Булаховіч

81 год надта малы тэрмін для таго, каб даць адназначную характарыстыку тагачасным гістарычным падзеям. Тым больш, калі справа датычыць такой складанай з'явы, як грамадзянская вайна. У гэтым сэнсе дзейнасць арміі генерала Станіслава Булак-Балаховіча, як і асоба самога генерала ўяўляюць сабою terra incognita, тэму да нядаўняга часу закрытую для шырокага абмеркавання. У савецкай гістарыяграфіі Балаховіч разглядаўся выключна як контррэвалюцыянэр, прыслужнік панскай Польшчы, вораг беларускага народу і савецкай улады наогул. Але ў апошні час сітуацыя змянілася. З'явілася шмат артыкулаў, прысвечаных гэтай тэматыцы, ў якіх робіцца спроба больш аб'ектыўна прааналізаваць дзейнасць яго і ягонай арміі.

Кажучы ўласна пра Балаховіча трэба адзначыць, што для беларускіх дзеячоў ён не быў постацю цалкам невядомай. Перад І Сусветнаю вайною Балаховіч належаў да расейскай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, меў некаторыя знаёмствы сярод беларускай палітычнай эліты (напрыклад, яго добрым знаёмым быў Павал Аляксюк).

У 1918 г. пасля заняцця Беларусі немцамі Балаховіч уступае ў Чырвоную Армію, але ўжо ўвосень гэтага ж года, пазбягаючы небяспекі арышту бальшавікамі, пераходзіць на бок белагвардзейцаў. У лагеры белых ён таксама ледзьве не становіцца ахвяраю празмернай амбіцыйнасці Юдзеніча і Радзянкі. Таму годам пазней, падчас канферэнцыі краін Балтыі, Украіны і Беларусі, што праходзіла ў Юр'еве (Тарту, Дэрпт), Балаховіч без ваганняў прымае прапанову пераходу на службу Беларускай Народнай Рэспубліцы засведчыўшы пры гэтым, што ідзя барацьбы за незалежнасць Беларусі яму шмат бліжэйшая, чым удзел у контррэвалюцыйных пачынаннях белых генералаў.

Увесь гэты час аддзелы Балаховіча знаходзіліся ў Эстоніі на ўтрыманні эстонскага ўраду, які разглядаў звязаныя з гэтым выдаткі, як пазыку ўраду БНР. Але хутка Эстонія пачала мірныя перамовы з Савецкай Расеяй і для беларусаў найважнейшай справай стаў пошук новага месца дыслакацыі аддзелаў Балаховіча ў тых дзяржавах, якія працягвалі вайну з Расеяй.



Ген. Станіслаў Булак-Балаховіч (сядзіць пасярэдзіне) са сваім штабам

Час ішоў, і праблема ўладкавання аддзелаў станавілася ўсе больш востраю. У сувязі з падпісаннем 2 лютага 1920 года паміж Эстоніяй і Расеяй мірнай дамовы Кастусь Езавітаў, прадстаўнік ураду БНР, у лісце да Пілсудзкага звяртаецца з просьбаю выдзялення аддзелу Балаховіча адрэзку фронту. Ужо 23 лютага паміж Балаховічам і палякамі падпісваецца адпаведная дамова аб пераходзе ягонага аддзелу пад польскае кіраўніцтва.

Трэцяга чэрвеня 1920 года Балаховіч ў складзе польскіх войск пачаў ваенныя дзеянні на Украіне ў ваколіцах Кіева. Атрымліваючы перамогу за перамогаю, яго атрады ўсе больш пасоўваліся на поўнач, гэта значыць на тэрыторыю Палесся. 26 верасня 1920 года Балаховіч праравўся праз бальшавіцкі фронт і падышоў да Пінска. Знішчыўшы па дарозе бронецягнік, яго аддзелы акружылі горад і папалудні конніца ўвайшла на вуліцы горада. Для 4-е савецкай арміі, штаб якой знаходзіўся ў Пінску, гэта было нечаканасцю, бо фронт у гэты час знаходзіўся на захад ад места. Частка штабу паспела выехаць на цягніку ў Лунінец. Кіраўніцтва ж падалося на захад, у бок франтавых адзінак. У палон былі ўзятыя частка штабу, 2000 жаўнераў і 400 афіцэраў; былі захопленыя каса, харчаванне, вопратка, 280 вагонаў, 3 лакаматывы і шмат іншага.

Раніцай 27 верасня бальшавікі выслалі з Лунінцу бронецягнік, які, пераехаўшы мост цераз Ясельду, пачаў абстрэльваць станцыю Пінск. Падчас шалёнай перастрэлкі балахоўцам удалося трапіць у вагон са зброяй. У выніку выбуху ўвесь цягнік прыйшоў у поўную нягоднасць. Рэшта дня і два наступныя прайшлі ў дробных сутычках з савецкімі аддзеламі, што пакідалі ваколіцы Янава (захопленага 27 верасня) і Драгічына Палескага.

Шматлікім ваенным перамогам аддзелу Балаховіча спадарожнічалі рабункі і гвалт над мірным насельніцтвам. Падобная жорсткасць была даволі характэрнай рысаю таго часу і выклікала ў звычайнага люду асуджэнне. Даведзеныя да адчаю і стомленыя бясконцай вайной, людзі спадзяваліся на мірнае вырашэнне дзяржаўных канфліктаў. Усюдыісная бесчалавечнасць змусіла жыхароў вёсак і мястэчак глядзець на вайскоўцаў з падазрэннем і недаверам. Памеры злачынстваў, здзейсненых жаўнерамі Балаховіча, перавысілі ўсялякія, нават ваенныя, нормы. Іх ахвярамі найчасцей з'яўляліся жыды. Балахоўцы абвінавачвалі іх ва ўсіх няшчасцях, якія напаткалі Расею ў выніку рэвалюцыі. Значная частка жыдоў на тых абшарах, дзе дзейнічаў Балаховіч, сапраўды падтрымлівала бальшавікоў, часта са зброяю у руках. Але гэта не апраўдвае пераследаў цэлага габрэйскага народу. А большасць здзейсненых балахоўцамі злачынстваў вынікала з дэмаралізацыі і прымітыўнай прагі нажывы. Лагер Балаховіча на пачатку жніўня 1920 года налічваў 400-500 вазоў, гэта значыць на аднаго жаўнера прыходзіўся адзін воз з нарабаваным дабром. І гэта ў варунках напаўпартызанскай вайны! Рапарты польскіх афіцэраў поўныя прыкладаў здзекаў балахоўцаў над жыдамі. Так у Шацку балахоўцы знішчылі цэлыя жыдоўскія сем'і і згвалтавалі ўсіх жыдовак ад 10-гадовых да старых. Абрабавалі ў месце ўсе дамы,ператварыўшы Шацк у адну вялікую сметніцу.

Не лепш трактавалі Балаховіча і мясцовыя сяляне, якіх абкладалі вялікімі рэквізіцыямі і вешалі ў выпадку хоць якого супраціву. На ягоным шляху праз пінскія балоты выключна ўсе сяляне пакідалі вёскі з-за страху перад аддзеламі атамана. Балаховіч афіцыйна караў за крымінальныя ўчынкі сваіх падуладных, праводзіў суды і расстрэлы. Праўда таксама і тое, што колькасць злачынстваў заўважна памяншалася падчас яго знаходжання ў аддзелах. Тым не менш, большасць злачынстваў заставалася беспакаранымі. Балаховіч, па сутнасьці, аказаўся бяссільным супраць дэмаралізацыі ў сваей арміі.

Асоба славутага генерала выступае даволі супярэчліваю з'яваю на тле тагачаснай палітычнай і ваеннай рэчаіснасці. Спачатку чырвонаармеец, потым белагвардзейскі генерал і змагар за незалежнасць БНР, Балаховіч пакуль што застаецца загадкаю і для гісторыкаў, і для шырокага кола грамадства.

**Сяргей Прылуцкі**

---

**ПРКАЗЪ N1.**
**Жителям города Пинска и окрестностей.**

**1.**
Мои войска после упорныхъ двухдневныхъ боевъ заняли город Пинскъ, гоня въ панике неприятеля.

**2.**
Мы несем народу покой и м рный трудъ.

**3.**
Вся Гражданская Власть передается Выборному Городскому Самоуправленію.

**4.**
Городскому Самоуправленію приложить все старанія, чтобы въ городе былъ порядокъ и спокойстве.

**5.**
Немедленно приступить къ работамъ на всехъ фабрикахъ, заводахъ мастерскихъ.

**6.**
Все рестораны, чайные, лавки, магазины, кооперативы и торговые предприятія открыть да бы народъ могъ получить живность и хлебъ.

**7.**
Все насилія со стороны солдатъ, самовольныя реквизиции и грабежи воспрещаю. Виновныхъ буду предавать военно-полевому суду.

**8.**
Все оставшіеся чиновники бывшей большевистской арміи должны зарегистрироваться до 12 час. 29-IX-20 г. у Начальника II Отдела Штаба Войскъ. Не исполнившіе сего будутъ считаться шпіонами и разстреливаться.

**9.**
Вс имущество оставленное большевиками немедленно доставить Коменданту города и неисполнивше сего будутъ преданы суду.

**10.**
Въездъ и выездъ изъ города разрешается только по пропускам отъ Коменданта и II-го отдела Штаба Войск.

**11.**
Все оружіе огнестрельное и холодное доставить въ Комендатуру 29-IX-20 г. до 12 час. дня. Виновные въ неисполнени сего будутъ считаться шпіонами и разстреливаться на месте.

Начальник Группы Полковник БАЛАХОВИЧ

Скрепилъ Начальник Полевого Штаба, Штабъ-Ротмстръ СИРОЧЕНКОВЪ.

28-IX-20 года.
г. Пинскъ.

# ЖИЛЬЁ И ЗДРАВООХРАНЕНИЕ

## ВОЗГЛАВЛЯЮТ ХИТ-ПАРАД БРЕСТСКИХ ПРОБЛЕМ

КЛУБ "ДЕДИЧ" ПРОВОДИТ МОНИТОРИНГ ОБЩЕСТВЕННОГО МНЕНИЯ ПО ПРОБЛЕМАМ РАЗВИТИЯ ГОРОДА БРЕСТА. В ЕГО РАМКАХ ЗАКОНЧЕНО ПИЛОТАЖНОЕ ИССЛЕДОВАНИЕ, РЕЗУЛЬТАТЫ КОТОРОГО, КАК МЫ СЧИТАЕМ, БУДУТ ИНТЕРЕСНЫ КАК ПРЕДСТАВИТЕЛЯМ МЕСТНОЙ ВЛАСТИ, АКТИВИСТАМ ОБЩЕСТВЕННОГО ДВИЖЕНИЯ, ТАК И ВСЕМ НЕРАВНОДУШНЫМ ЖИТЕЛЯМ НАШЕГО ГОРОДА.

В опросе приняло участие 150 брестчан из всех районов города, ошибка репрезентативности не превышает 0,05. В анкете мы предложили участникам опроса определить наиболее проблемные сферы городской жизни, а также самим назвать наиболее острые городские проблемы.

1. "Насколько Вы удовлетворены следующими сторонами своей жизни?":

| таб. 1 | Полностью удовлетворён | Скорее удовлетворён | Скорее не удовлетворён | Полностью не удовлетворён | Затрудняюсь ответить |
|---|---|---|---|---|---|
| Состоянием окружающей среды | 2,7 | 13,7 | 54,9 | 19,1 | 6,8 |
| Условиями для полноценного отдыха | 1,4 | 20,5 | 32,9 | 38,4 | 4,1 |
| Работой транспорта | 1,6 | 31,3 | 28,8 | 21,9 | 15,1 |
| Работой коммунальных служб | 4,1 | 13,7 | 42,5 | 28,8 | 8,2 |
| Медицинским обслуживанием | 0 | 17,8 | 34,2 | 41,1 | 5,5 |
| Охраной общественного порядка | 4,0 | 23,4 | 28,8 | 34,2 | 8,2 |
| Социальной защитой | 0 | 6,8 | 23,3 | 54,8 | 13,7 |
| Материальной обеспеченностью | 0 | 2,7 | 19,2 | 74,0 | 2,7 |

Анализ результатов в очередной раз показывает высокий уровень неудовлетворённости населения условиями своей жизни.

После вполне закономерного упоминания о недостаточной материальной обеспеченности, наибольшую степень недовольства брестчан вызывают **социальная защита** (несмотря на неимоверные усилия, прилагаемые властями для её осуществления, неудовлетворённость её уровнем высказывают 78,1% опрошенных), **медицинское обслуживание** (75,3%), а также **состояние окружающей среды** (74%). Ненамного больше население удовлетворено **условиями для полноценного отдыха** (71,3%) и **работой коммунальных служб** (71,3%). Относительно терпимо общественность воспринимает **охрану общественного порядка** ("всего" 63% недовольных) и **работу транспорта** (50,7%).

В этой связи представляют интерес ответы на вопрос «В какой сфере городской жизни накопилось наибольшее количество проблем, требующих срочного разрешения?», в %.

| | |
|---|---|
| 1. Жилищная проблема | 19,3 |
| 2. Здравоохранение | 19,2 |
| 3. Образование | 14,2 |
| 4. Экология | 8,7 |
| 5. Коммунальное хозяйство, благоустройство, озеленение | 7,8 |
| 6. Сохранение культурного наследия | 5,9 |
| 7. Организация досуга | 4,6 |
| 8. Транспорт | 3,7 |

Как видно, наибольшую остроту представляют проблемы в сфере **жилья** (эту проблему выделили 19,3% опрошенных), **здравоохранения** (19,2%) и **образования** (14,2%). В то же время, несмотря на значительное недовольство населения **состоянием окружающей среды**, ответы на этот вопрос показывают, что данная проблема не имеет для общества первостепенного значения (8,7%), хотя всё-таки вызывает гораздо больше нареканий, чем, **работа транспорта** (3,7%), **организация досуга** (4,6%) и **проблема сохранения культурного наследия** (5,9%). Относительно благополучной представляется брестчанам и сфера ответственности **коммунальных служб** (7,8% опрошенных отметили наличие острых проблем в этой области).

В этом вопросе мы предоставили анкетируемым возможность дописать свой вариант ответа, т.е. предложить другую наиболее значимую проблему. Среди ответов наиболее часто встречались: дороги, нехватка детсадов в микрорайонах, низкая духовность, наркомания, телевидение, притеснение "непопулярных" религий.

В следующих вопросах анкеты мы попросили опрашиваемых ответить, какие именно проблемы волнуют их больше всего в этих сферах. Для того, чтобы иметь возможность обработать их и представить в систематизированном виде, нам пришлось обобщить ответы, из-за чего они несколько потеряли конкретность, однако общие тенденции стали видны более отчётливо. Итак, какие же проблемы брестчане считают наиболее серьёзными:

1. В сфере здравоохранения, в %:

| | |
|---|---|
| 1. Низкая квалификация персонала | 33,3 |
| 2. Дороговизна лекарств | 27,1 |
| 3. Недостаточное финансирование | 10,4 |
| 4. Техническая оснащённость больниц | 7,4 |
| 5. Взяточничество | 6,3 |
| 6. Мало городских поликлиник | 5,2 |
| 7. Обеспечение медикаментами | 4,1 |
| 8. Недостаток некоторых специалистов | 3,1 |
| 9. Формализм, бюрократия | 1,0 |
| 10. Безответственность врачей | 1,0 |

Имеет смысл обратить внимание, что, в отличие от других областей жизни, где все проблемы вытекают из финансовых трудностей, в сфере здравоохранения на первое место вышла проблема, имеющая в своей основе совсем другие причины.

2. В сфере жилья, в %:

| | |
|---|---|
| 1. Дороговизна жилья | 34,6 |
| 2. Сложности с получением квартир молодыми семьями | 30,9 |
| 3. Нехватка жилплощади | 23,6 |
| 4. Некачественное жильё | 7,3 |
| 5. Недостаточное строительство | 3,6 |

3. В сфере образования, в %:

| | |
|---|---|
| 1. Низкое качество, недоступность | 38,7 |
| 2. Недостаточное финансирование | 22,4 |
| 3. Отсутствие материальной базы | 17,9 |
| 4. Взяточничество | 11,9 |
| 5. Дорогое платное образование | 7,5 |
| 6. Низкая престижность | 1,5 |

4. В сфере экологии, в %:

| | |
|---|---|
| 1. Загазованность города | 39,4 |
| 2. Загрязнение вод, почвы | 21,3 |
| 3. Озеленение города | 11,5 |
| 4. Нехватка денег на экологич. проблемы | 9,8 |
| 5. Недостаточный контроль со стороны экологических служб | 9,8 |
| 6. Разрушение систем канализации | 6,6 |
| 7. Отсутствие общественных туалетов | 1,7 |

5. В сфере коммунального хозяйства, в %:

| | |
|---|---|
| 1. Неудовлетворительная работа ЖКХ | 38,1 |
| 2. Высокая стоимость коммунальных услуг | 15,9 |
| 3. Неудовл. состояние теплосети | 15,9 |
| 4. Уборка улиц | 7,9 |
| 5. Неблагоустроенность микрорайонов | 6,5 |
| 6. Низкий уровень обслуживания | 6,4 |
| 7. Пьянство в рабочее время | 4,8 |
| 8. Дороги | 4,7 |

В этой сфере вернёмся к конкретике и отметим наиболее актуальные проблемы, которые выявились в ходе опроса. Значительное количество опрашиваемых отметило недостаток детских площадок во дворах, отсутствие общественных туалетов, проблемы с отоплением квартир в зимний период, неприглядный вид р.Мухавец из-за постоянного загрязнения бытовым мусором. Отмечались проблемы с персоналом ЖЭСов, в частности неудовлетворительная работа сантехников, уборка улиц и т.п.

6. В сфере культуры, в %:

| | |
|---|---|
| 1. Низкий уровень культуры населения | 29,6 |
| 2. Сохранность памятников архитектуры | 20,4 |
| 3. Безразличие населения к сохранению культурного наследия | 18,2 |
| 4. Отсутствие детских кафе, кинотеатров | 16,0 |
| 5. Тотальная русификация | 6,8 |
| 6. Недостаток библиотек, клубов по интересам | 4,6 |
| 7. Перекраивание истории | 2,3 |
| 8. Высокая стоимость билетов на концерты | 2,3 |

7. В сфере организации досуга, в %:

| | |
|---|---|
| 1. Недостаток культурных мероприятий для молодёжи | 40,5 |
| 2. Дороговизна в сфере организации досуга | 32,4 |
| 3. Необустроенность мест отдыха | 21,6 |
| 4. Охрана порядка во время развлекательных мероприятий | 5,4 |

В этой сфере, как и в двух предыдущих пунктах, чаще других упоминались проблемы с детским отдыхом, отсутствием поддержки молодёжной субкультуры (граффити, роллеры, рок-музыка).

8. В транспортной сфере, в %:

| | |
|---|---|
| 1. Нехватка транспорта | 30,3 |
| 2. Изношенность транспортного парка | 25,8 |
| 3. Перегруженность транспорта | 12,1 |
| 4. Несоблюдение графика движения | 9,1 |
| 5. Дороги | 7,6 |
| 6. Вредное воздействие на экологию | 6,1 |
| 7. Недостаточно маршрутов в отдельные р-ны | 6,1 |
| 8. Низкая культура обслуживания | 3,0 |

В этой сфере достаточно часто упоминались проблемы с ж/д переездами на ул. Брестских дивизий, грязь в салонах общественного транспорта, порванные сиденья на автобусных маршрутах № 5, 15, 17. Прозвучало несколько предложений пустить автобус по маршруту Ленина–Мицкевича–бул. Космонавтов–Машерова, а также "продолжать латать дыры в асфальте только во время дождя".

Приведённые цифры не требуют глубокого анализа и комментария. Каждый, кому небезразлична тематика нашего исследования, может сам сделать соответствующие выводы и использовать эти данные в своей работе. Отметим только, что с точки зрения президентской кампании активистам избирательных штабов имеет смысл при подготовке агитационных материалов обратить внимание на наиболее проблемные в Бресте сферы жизни: жильё (поддержка молодых семей), здравоохранение (проблема технической оснащённости и профессионализма), образование и экологию.

К сожалению, скромные размеры газетной статьи не позволяют показать изменения общественного мнения в зависимости от возраста, уровня образования и места жительства опрашиваемых. Если вас интересуют более конкретные данные по какому-либо микрорайону города, по определённому возрасту и т.п., обращайтесь в клуб "Дедич", и мы с удовольствием предоставим любую интересующую информацию. Также необходимо заметить, что проведённое исследование носит пилотажный характер и специалистами нашей социологической группы на его основе разрабатывается более глубокое исследование, которое планируется завершить в августе и опубликовать до президентских выборов.

**Дмитрий Ляшов**

# Адміністратыўныя затрыманні

Адным з самых асноўных сродкаў уздзеяння на актыўных удзельнікаў апазіцыйных акцый пратэсту ў нашай краіне з'яўляецца прыцягненне да адміністратыўнай адказнасці.

У 1996 г. да яе было прыцягнута каля 1000 паліт. актывістаў, у 1997 годзе прыкладна каля 800, у 1998 годзе гэтая лічба знізілась, але павялічылась колькасць крымінальных справаў. Веданне заканадаўства, парадку абскарджання адміністратыўных спагнанняў можа дапагчы абараніць сябе, свае палітычныя ды грамадзянскія правы.

Згодна з арт. 9 КаАП РБ адміністратыўным правапарушэннем (праступкам) прызнаецца дзеянне, якое пасягае на дзяржаўны альбо грамадскі парадак, уласнасць, правы і свабоды грамадзян, на ўсталяваны парадак кіравання, супрацьпраўнае, віноўнае (наўмыснае альбо неасцярожнае) дзеянне альбо бяздзеянне, за якое заканадаўствам прадугледжана адміністратыўная адказнасць. Адміністратыўнай адказнасці падлягаюць асобы, якія дасягнулі 16 гадоў.

Згодна з арт. 234 КаАП РБ аб адміністратыўным правапарушэнні павінен быць складзены пратакол упаўнаважанай на гэта асобай. Пратакол аб адміністратыўным правапарушэнні павінен утрымліваць: дату і месца яго складання, пасаду, імя, імя па бацьку асобы, што склала пратакол; дадзеныя аб асобе правапарушальніка; месца, час здзяснення і сутнасць адміністратыўнага правапарушэння; нарматыўны акт, які прадугледжвае дадзенае правапарушэнне; прозвішчы, адрэсы сведак і пацярпелых, калі яны ёсць; тлумачэнні парушальніка; іншыя дадзеныя, неабходныя для разгляду справы.

Пратакол падпісваецца асобай, якая яго склала, і асобай, якая здзейсніла адміністратыўнае правапарушэнне, а таксама сведкамі (калі такія ёсць). У выпадку адмаўлення падпісаць пратакол у ім павінен быць зроблены адпаведны запіс. Асоба, на якую складзены пратакол, мае права напісаць свае тлумачэнні і, у выпадку адмовы падпісаць пратакол, мае права напісаць прычыны адмаўлення. На практыцы подпіс пратакола ці адмаўленне ад яго вялікай ролі не грае, а вось уласныя тлумачэнні напісаць варта. Калі ў вас ёсць сведкі, якія здольныя паказаць, што вы не ўдзельнічалі ў акцыі ці праходзілі міма, у пратаколе трэба ўказаць іх імёны. Па заканчэнню напісання тлумачэнняў пажадана паставіць літару, альбо перакрэсліць вольнае месца, каб там было немагчыма чаго-небудзь дапісаць.

Яшчэ вельмі цікавая акалічнасць: пратакол, як правіла, складаецца не тымі асобамі, што непасрэдна затрымлівалі чалавека. Яны пішуць рапарт, на падставе якога складаюць пратакол. Калі затрыманых шмат, то і сведкамі ў судзе выступаюць нават не тыя, хто складаў пратакол. Атрымліваецца своеасаблівы канвеер: адзін затрымлівае, другі складае пратакол, а трэці выступае сведкам. Гэта таксама можна выкарыстаць у судзе. Калі сведак два, часам яны даюць розныя паказанні. Але на судзе мы спынімся крыху ніжэй.

Веданне патрабаванняў да пратаколу часам можна вельмі паспяхова выкарыстаць падчас суда. Калі вы заўважылі, што ў пратаколе не стае аднаго з кампанентаў, такі пратакол, згодна з Пастановай Пленума Вярхоўнага Суда ад 25 сакавіка 1999 г., павінен быць адпраўлены назад таму органу, які яго складаў, на дапрацоўку і ліквідаванне недахопаў, прычым час выпраўлення пратаколу не спыняе тэрміну, на працягу якога асоба можа быць прыцягнутая да адміністратыўнай адказнасці. Гэта азначае, што, пакуль міліцыя выпраўляе пратакол, два месяцы, адведзеныя для вашага асуджэння, ідуць, і міліцыя можа проста не паспець зрабіць усе як след.

Другі прыклад можна прывесці з рэальнага жыцця. Спадар С. удзельнічаў у выбарчай кампаніі 16 траўня і быў затрыманы са скрынкай для галасавання на вуліцы. Міліцыя склала на яго пратакол і прыкладна праз месяц яго выклікалі ў суд. Але спадар С. ведаў, што згодна з арт. 234.1 КаАП РБ міліцыя не мае права складаць пратакол па арт. 167.3 КаАП РБ (парушэнне заканадаўства аб выбарах), па якім яго абвінавачвалі. Згодна з Пастановай пленума Вярхоўнага Суда ад 25.03.99 г., калі пратакол складзены не адпаведнай асобай ці органам, такі пратакол вяртаецца назад. Гэта і было заяўлена спадаром С., і суддзя быў вымушаны адправіць пратакол назад у РАУС. Пакуль пратакол перапраўлялі з месца на месца, прайшоў двухмесячны тэрмін, на працягу якога спадара С. можна было прыцягнуць да адміністратыўнай адказнасці. ¨н застаўся непакараным.

Згодна з Арт. 242 КаАП РБ, тэрмін адміністратыўнага затрымання можа цягнуцца не больш за 3 гадзіны, але затрыманыя за парушэнне парадку правядзення масавых мерапрыемстваў і за дробнае хуліганства могуць быць затрыманыя да разгляду справы ў судзе, г.зн. да 3 сутак. Тэрмін адміністратыўнага затрымання пачынае адлічвацца з моманту дастаўкі ў пастарунак для складання пратакола. У пастарунку вас могуць падвергнуць дагляду рэчаў і асабістаму дагляду. У гэтым выпадку трэба памятаць, што аб усіх гэтых дзеяннях павінен быць складзены пратакол ці зроблена паметка ў складзеным пратаколе, акрамя гэтага асабісты дагляд павінен праводзіцца асобай аднаго і таго ж полу з дагляддаемым у прысутнасці дзвюх панятых таго ж полу. Дагляд асабістых рэчаў павінен праводзіцца ў прысутнасці ўладальніка. Усіх затрыманых з РАУСаў, як правіла, да разгляду справы ў судзе адвозяць у прыёмнік-размеркавальнік. Нягледзячы на тое, што ў Арт. 240 КаАП РБ запісана, што па просьбе асобы, якая затрымана ў адміністратыўным парадку, аб месцы яго знаходжання паведамляюць сваякам, адміністрацыі па месцу працы ці вучобы, супрацоўнікі міліцыі часам гэтага не робяць. Таму ў пастарунку, калі разам з вамі ёсць затрыманыя непаўнагадовыя, папрасіце іх паведаміць вашым сваякам і дайце ім свой хатні тэлефон і тэлефон Праваабарончага Цэнтру «Вясна-96». Аб затрыманні непаўнагадовых іх бацькам паведамляюць абавязкова, акрамя таго непаўнагадовым не даюць арышты і з пастарунка іх выпусцяць праз 3 гадзіны.

Каб аказаць дастойны супраціў у судзе, неабходна ведаць свае працэсуальныя правы і, безумоўна, карыстацца імі. Асоба, якая прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасці мае права:

- знаёміцца з матэрыяламі справы, даваць тлумачэнні, прадстаўляць доказы, заяўляць хадайніцтвы;
- пры разглядзе справы карыстацца юрыдычнай дапамогай адваката, выступаць на роднай мове і карыстацца паслугамі перакладчыка (для тых, хто не валодае мовай, на якой вядзецца судовае паседжанне - беларускай і рускай);
- абскарджваць пастанову па справе.



Фота IREX/ProMedia

Першае, што трэба зрабіць - гэта заявіць хадайніцтва аб азнаямленні з матэрыяламі справы. Адразу неабходна звярнуць увагу на пратакол. Згодна з п. 3 Пастановы Пленума Вярхоўнага Суда ад 25 сакавіка 1999 г. пратакол аб адміністратыўным правапарушэнні павінен адпавядаць патрабаванням Арт. 235 КаАП РБ.

Акрамя таго, асоба якая прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасці ў судовым працэсе мае права задаваць пытанні сведкам, гэта вельмі важна ведаць. На гэтым можна пабудаваць уласную абарону. Вышэй мы ўжо разглядалі той канвеер, які дзейнічае пры затрыманні. Пратакол пішацца на падставе пададзеных рапартоў асобаў, якія затрымлівалі, а сведкі, якія выступаюць у судзе, часам і ў вочы вас не бачылі, і таму яны кажуць тое, што напісана ў пратаколе, не ведаючы ўсіх акалічнасцяў. Гэта можна выкарыстаць, пастараўшыся загнаць сваімі пытаннямі сведкаў у кут ці дасягнуць таго, што яны пачнуць блытацца і даваць розныя паказанні (пакуль на пытанні адказвае другі, першы ў гэты час не прысутнічае ў пакоі). Трэба задаваць пытанні аб тым, дзе вас бачылі, што вы трымалі ў руках. Калі вы не трымалі ў руках сцягоў ці плакатаў, тады трэба спытаць, якім чынам вы, на думку міліцыі, удзельнічалі ў акцыі. Загадзя запытацца, чаму міліцыя вырашыла, што гэта была акцыя (шэсце, мітынг, пікет і г.д.) Губляць асабліва вам няма чаго, таму можна смела эксперыментаваць, часам гэта прыводзіць да патрэбных вынікаў. Але і пітаць ілюзіяў наконт нашай судовай сістэмы няварта. Усе суддзі ў нашай краіне прызначаюцца і здымаюцца асабіста Лукашэнкам, таму нават калі ваша віна будзе пад пытаннем, яны вынясуць вам спагнанне, але яго ступень бывае рознай. Горш, калі вы трапілі ўжо другі раз на працягу году, тут папярэджаннем ужо не абыдзешся.

Асобна я б хацеў удакладніць пытанне ўдзелу ў працэсе адваката. Справа ў тым, што наша адміністратыўнае заканадаўства з'яўляецца ўжо даволі састарэлым, да таго ж і прымаўся Кодэкс яшчэ ў 1984 годзе. Таму правам на дапамогу адваката асоба можа карыстацца толькі пры разглядзе справы аб адміністратыўным правапарушэнні. Іншымі словамі, непасрэдна ў судзе, а не з моманту затрымання, як у крымінальна-працэсуальным заканадаўстве. Можна заяўляць хадайніцтва аб удзеле ў судзе грамадскага абаронцы ад якой-небудзь грамадскай арганізацыі. Але трэба ведаць, што суддзя мае права не дапусціць грамадскага абаронцу да ўдзелу ў судзе.

Самыя распаўсюджаныя адміністратыўныя спагнанні, якія выкарыстоўваюць супраць дэманстрантаў, - гэта папярэджанні, штрафы і адміністратыўныя арышты. Адміністратыўныя арышты выносяца ад 3 да 15 сутак. Арышты не выкарыстоўваюцца да непаўнагадовых, да цяжарных жанчын, жанчын, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 12 гадоў, інвалідаў першай і другой групаў. Калі вы атрымалі праз тры дні на рукі рашэнне аб прыцягненні вас да адміністратыўнай адказнасці, варта падумаць аб яго абскарджанні.

**Валянцін Стэфановіч, юрыст праваабарончага цэнтру «Вясна»**



**Аднаго з удзельнікаў мітынга затрымалі за карыстанне незарэгістраваній сімволікай. Менск, 25 сакавіка 2001г., Дзень Волі. Фота IREX/ProMedia**

# ГАРОДНЯ:
## ЗА ДВА ГАДЫ НІЧОГА НОВАГА

**1128 г.** Першая летапісная згадка аб Гародні як цэнтры ўдзельнага княства.

**1985 г.** кастрычнік. Нарадзіўся 250 – тысячны жыхар горада.

Вырашыла аднойчы мая універсітэцкая група пабачыць славутасці Гародні. Спачатку хацелі паехаць амаль усе. Але ўрэшце у цягнік села 5 чалавек. У тым ліку і я. Я быў у Гародні два гады таму і вырашыў паглядзець, ці змянілася што–небудзь. А дакладней, ці болей стала бараў з півам, ці не.

Гародня сустрэла нас халодным ветрам і сонейкам. Аднак пазней сонца перыядычна і даволі надоўга хавалася ў хмары.

У горадзе шмат зялёных дрэваў, прыгожых гарадзенак, незвычайных старых будынкаў. Па дарозе да замкаў мы завіталі ў Гарадзенскі універсітэт імя Янкі Купалы. Берасцейскі універсітэт імя А. С. Пушкіна, канешне ж, нашмат лепшы. Наведалі старую царкву ў Каложы, якая з XII ст. стаіць над Нёманам. Яе зараз рэстаўруюць. У каменныя сцены царквы ўмураваны рознакаляровыя пласціны і камяні, утвараючы крыжы і арнамент. Побач з царквою знаходзіцца камень, які нагадвае пра Грунвальдскую бітву, пляцоўка побач моцна забруджана. Ад царквы мы спусціліся да Нёмана. Наш Мухавец чысцейшы за гэтую брудную рэчку.

І вось ў рэшце рэшт у 10 гадзін мы падышлі да Замкавай гары, на якой знаходзіцца Стары замак. А побач – Новы замак, пабудаваны ў 1751 г. Замкі вельмі прыгожыя, стаяць на ўзвышшах высока над Нёманам.Тут, ў акружаным расейскімі салдатамі гарадзенскім Новым замку, 25 лістапада 1795г. апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падпісаў адмаўленне ад прастолу, прызнаўшы тым самым канчатковы падзел некалі адной з самых магутных дзяржаў Еўропы.



Фізфак ГрДУ

Новы замак – гэта былы палац караля, які быў вельмі моцна зменены падчас рэстаўрацый. Зараз там размяшчаюцца бібліятэка і гістарычны музей, дзе час ад часу змяшчаюць новыя экспазіцыі. Ад Старога замку засталіся рэшткі мура, пабудаваныя яшчэ пры Вітаўце. Больш позняя пабудовы адрэстаўраваны.

Музейныя экспазіцыі Новага замку намнога меншыя па свайму аб'ёму, чым Старога, аднак каб іх агледзець поўнасцю, патрабуецца больш за тры гадзіны, што вельмі стамляе.

Пасля агляду музеяў мы накіраваліся на пошукі тралейбуснага прыпынку, адкуль змаглі б даехаць да Кургана Славы. Пасля шматлікіх пытанняў, якія мы задалі жыхарам горада, у нас склалася ўражанне, што Курган Славы не мае пастаяннага месцазнаходжання, таму што кожны наступны іх адказ абвяргаў папярэднія. Адначасова мы аглядалі цэнтральную частку горада з мэтай знайсці кавярню, каб паабедаць. На жаль, нічога прыстойнага не было. У Берасці, на маю думку, такой праблемы не ўзнікла б. Мы былі вымушаны падсілкавацца сваімі прыпасамі на траўцы, недалёка ад Кургана Славы.

Адзін са старых, разбітых тралейбусаў, якія выклікаюць яшчэ большы жах, чым берасцейскія, давёз нас да аўтавакзала, побач з якім, па словах мясцовых жыхароў, знаходзіўся бар з добрым півам. Бар так і застаўся не знойдзены.

Пешшу мы накіраваліся па нейкай пыльнай і разбітай вуліцы (яна нагадвала вясковую) да заапарку і чыгуначнага вакзала. У нас у Берасці папрыстойней: пакуль што не ваняе і не валяецца конскі навоз каля ўваходу ва Упраўленне Міністэрства ўнутраных спраў.

Гарадзенскі вакзал значна саступае нашаму па памерах і па



прыгажосці. Аднак, у адрозненні ад берасцейскага, у ім ёсць платная зала чакання з мяккімі крэсламі і тэлевізарам.

Мясцовы заапарк за два апошнія гады таксама не надта змяніўся. Выгляд жывёлін у цесных клетках выклікае сум. Цікава толькі ў тэрарыуме ды радуюць вока прыгожыя акварыумныя рыбкі.

Гарадзенскае піва я піў толькі з бутэлек, якія набыў у прывакзальнай краме...

Як і ў былы раз, цікава было аглядаць старыя будынкі і музеі Гародні, але ж нармалёвых бараў і добрага гарадзенскага піва я зноў не знайшоў.

**Дзікі**

## ДАРЭЧЫ

Сталін паказаў, як можна кіраваць савецкімі народамі. Брэжнеў паказаў, што ўсялякі дурань можа кіраваць савецкімі беларусамі. Лукашэнка паказаў, што не ўсялякі дурань можа імі кіраваць.

***

- Чым адрозніваецца беларус ад армяніна? - Армянін п'е каньяк, а беларус п'е, як конь.

***

У Чарнобыльскай зоне нельга збіраць грыбы: разбягаюцца.

***

Сядзяць пшэк, хахол і беларус у бары й смокчуць піва. Раптам кожнаму ў келіх трапляе муха.

Пшэк пакруціў носа, дый пайшоў па новае піва.

Хахол шчолкнуў па мухе так што яна адляцела й працягнуў смактаць далей.

Беларус дастаў муху з куфэлю і пачаў яе аб стол біць ды крычаць: «Аддамо дура маё піва!»

***

- Калі с вашым банкам нешта здарыцца хто будзе гарантам?
- Нацбанк.
- А калі з нацбанкам?
- Прэзідэнт краіны.
- А калі з прэзідэнтам?
- І што для такой справы вам шкада вашых 150 баксаў?

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў бюлетэня ў навучальных установах Берасцейскай вобласці. Тэл. (0162) 20-31-21.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці. Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 20-31-21**

№ 3 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
ліпень 2001

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

ДАК "ДЗЕДЗІЧ" СКЛАДАЕ ПАДЗЯКУ ЦЭНТРУ "ВЕЖА" ЗА АКАЗАНУЮ ДАПАМОГУ

**Заснавальнік** - Берасцейскае абласное моладзевае грамадскае аб'яднанне **Даследча-аналітычны клуб "ДЗЕДЗІЧ"**
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк** 17.07.2001 года ў 18-00
**Наклад** 299 асобнікаў.

**Галоўны рэдактар:** Б. Дэпеша.
**Рэдакцыйная калегія:** Я.Берасцейская, Д.Раманоўская, У.Тарноўскі

**Кантактны тэлефон:** 20-31-21
**E-mail:** dzedzich@mail.ru